# Нашы юбіляры

## ЛЕЎ МІХАЙЛАВІЧ ШАКУН



14 верасня спаўняецца 60 год Льву Міхайлавічу Шакуну, доктару філалагічных навук, прафесару, Заслужанаму работніку вышэйшай школы Беларускай ССР, загадчыку кафедры беларускай мовы.

Л. М. Шакун нарадзіўся ў вёсцы Браткава Капыльскага раёна. Яго вучоба ў сярэдняй школе была перарвана вайной. Неўзабаве ён уступае ў рады беларускіх партызан. Пасля вызвалення Беларусі працягвае вучобу. У 1945 годзе паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. З 1950 па 1953 гады—аспірант. У 1953 годзе ён паспяхова абараняе кандыдацкую дысертацыю і з гэтага часу працуе на кафедры беларускай мовы універсітэта. У 1965 годзе Леў Міхайлавіч абараніў доктарскую дысертацыю. З 1967 года ён прафесар і ўзначальвае кафедру.

Вялікую ўвагу Л. М. Шакун удзяляе стварэнню вучэбнай літаратуры. Ім распрацаваны новыя лекцыйныя і спецыяльныя курсы. Як адзін з вядучых лінгвістаў рэспублікі ён займаецца распрацоўкай актуальных праблем беларускага і параўнальнага славянскага мовазнаўства, надрукаваў звыш 100 навуковых прац. Асабліва вялікія заслугі Л. М. Шакуна ў вывучэнні гісторыі беларускай літаратурнай мовы. Яму належаць фундаментальныя працы ў гэтай галіне мовазнаўчай навукі: «Нарысы гісторыі беларускай літаратурнай мовы» (Мінск, 1960), «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы» (Мінск, 1963, 1984). Пры вывучэнні сучаснай беларускай мовы Л. М. Шакун найбольш паспяхова распрацоўвае пытанні словаўтварэння. Ён выдаў агульнатэарэтычнае даследаванне «Словаўтварэнне» (Мінск, 1978). Прыхільна былі сустрэты навуковымі коламі яго і А. М. Бардовіча (сааўтар) «Марфемны слоўнік беларускай мовы» (Мінск, 1975).

Л. М. Шакун праводзіць вялікую навукова-арганізацыйную работу. Ён з'яўляецца намеснікам старшыні секцыі роднай мовы і літаратуры Навукова-метадычнага савета па вышэйшай філалагічнай адукацыі пры Мінвну СССР, членам Навуковага савета Акадэміі навук БССР па праблемах мовазнаўства, старшынёй спецыялізаваных саветаў пры Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый у галіне мовазнаўства, вучоным сакратаром Савета Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, намеснікам рэдактара серыі нумар 4 «Весніка БДУ імя У. І. Леніна», членам рэдакцыйнай калегіі перыядычнага міжвузаўскага зборніка «Беларуская мова».

Баявыя і працоўныя поспехі Л. М. Шакуна адзначаны ордэнам «Айчыннай вайны» II ступені, медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені і іншымі баявымі медалямі, юбілейным медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, нагрудным значком Мінвну СССР «За выдатныя поспехі ў рабоце». Ён удастоены ганаровага звання Заслужанага работніка вышэйшай школы Беларускай ССР.

Сваёй вучэбнай, навукова-даследчай і палітыка-выхаваўчай дзейнасцю, эрудыцыяй і прынцыповасцю, дабразычлівасцю і спагадлівасцю Л. М. Шакун заслужыў прызнанне і любоў калектыва філалагічнага факультэта, усіх тых, хто хоць калі-небудзь з ім сутыкаўся. 60-гадовы юбілей ён сустракае ў росквіце творчых сіл. Студэнты, калегі па рабоце, вучні і сябры жадаюць Льву Міхайлавічу Шакуну добрага здароўя, плённай працы, здзяйснення ўсіх задум.

**У. М. Лазоўскі.**